# Асека




Вёска Асека прытулілася край гасцінца, з яго прыляснога боку, амаль у сасновым бары, у кіламетры на захад ад Сашыцы. Першы пісьмовы дакумент ад 1836 года абазначае яе пад назвай Асіка ці то Асіека, ва ўсялякім разе не так, як гучыць сёння.

Вёска ў той час належыць панам Стоцкім. Першы з вядомых на той момант – Францішак Стоцкі – мае 3 двары, 42 дзесяціны зямлі. Першы сялянскі двор – Андрэя Слукі (найстарэйшы з вядомых жыхароў вёскі – 1756 года нараджэння) і яго братоў Івана і Аляксея. Другі належыць Андрэю Скробату, трэці – Амельяну Артановічу (хутчэй Антановічу) – усяго 20 жыхароў. Па суседству ўладанне паноў Ізбіцкага і Кунцэвіча. Зямля Ізбіцкіх на пэўны момант з афіцыйных дакументаў чамусьці знікае і зноў з'явіцца, толькі калі вёска будзе мець сучасную назву. А пакуль уладанні Ізбіцкіх і Кунцэвіча маюць назву вёска Новышэ. Чаму? Раней жыў нехта з такім прозвішчам? Не ведаю. У Новышах пражывае ў чатырох дварах 24 чалавекі (мужчын 13, жанчын 11) – Чыбукі: Лука, Сцяпан, Дзям'ян і Карп Максімовіч (дадзеныя таксама за 1836 год).

**М.Пейган "Ад Мормажава да Залесся. Вёскі Сялецкага прыхода"**

# Варажбіты



Вёска Варажбіты перакрэслена трактам амаль пасярэдзіне; не лягла ўзбоч яго, як прынята, а ўпоперак. Што ж гэта за дарога "перарэзала" сяло? Мае яна шмат назваў. З незапамятных часоў вядома як старадаўні сялецкі гасцінец на Пружаны. а меры ўзвышэння Ружан ён у "Люстрацыі дамб і мастоў" казначэйскай камісіі скарбовай Вялікага Княства Літоўскага з 1766 года ўжо мае ганаровую назву варшаўскага, што падкрэслівае яго значэнне для дзяржавы. У Расійскай імперыі за ім пэўным чынам будуць сачыць і наглядаць, прыжывецца новая назва "Кацярынінскі шлях". На справе ж роля яго пачне падаць, як ні шкада. Саперніцтва з новымі шляхамі не вытрымае.

М.Пейган "Ад Мормажава да Залесся. Вёскі Сялецкага прыхода"

# Зарадахач і іншыя хутары




***УСПАМІНЫ***

***Няма Зарадахач. Як і не было***
***Сядзібы, клуні з клёкатам буслоў.***
***Нібы з вадою Ясельды, сплыло***
***Усё – ні сенажацяў, ні стагоў,***
***Ні палеткаў з копамі снапоў…***
***Тут вайна дзяцінства расстраляла.***
***Балюча.***
***Не пазбавіцца ад сноў.***
***А памяць да Зарадахач вяртала.***

**Валянціна Дабрыніна**
*24.11.2009 г.*

**Эпіграфам да апісання гэтага хутара, як і многіх іншых, зніклых фізічна, а хутка і ў памяці чалавечай, ёсць творчасць спадчынніцы тых мясцін, якая не прызнае сябе зарадахачанкай, але носіць у сэрцы памяць аб ім, як мясціне, што была надзвычай дарагой для яе маці і неабыякавай для яе.**

**М.Пейган “Ад Мормажава да Залесся. Вёскі Сялецкага прыхода”**

# Касілавічы



Стаяў позні верасень 179.., а магчыма, гэта быў 180... год. Гняды конік лёгкай хадой цягнуў стары воз з добра змазанымі шмаравідлам коламі. Дарога падымалася ўгару, воз раз-пораз схіляўся то ў адзін бок, то ў другі, на выбоінах, што надта густа пакрывалі каляю ля падэшвы ўзгорка і на самым яго пачатку, далей дарога станавілася больш спраўнай. На возе сядзеў фурман у шапцы магерцы і простай світцы цёмна-шэрага колеру, якая ля шыі была пачарнелая ад шматдзённага поту і даўніны. Сядзеў мужчына на папярэчыне драбіны, звесіўшы долу ногі, абутыя ў ліпавыя лапці, моцна разношаныя, але даволі спраўныя, каб паслужыць яшчэ нейкі адрэзак часу. І яздок, і конь прыспешваліся, неба “вісела” не адзін ужо дзень, але, на шчасце, пакуль дажджу не было. Яны ведалі, што як толькі апынуцца на самой макаўцы Пляхаўшчынскай гары, то за густымі зараснікамі крушыны, хмелю і маладой альхі не зусім ясна, але прарэжуцца абрысы хат, клуняў і высокага жураўля каля агульнавясковага калодзежа, які яскравымі лініямі свайго “г”- падобнага верху ўжо пачаў вырысоўвацца на фоне сівізны неба і зялёнай фарбы недалёкага маладога сасновага барка, што быццам бы прытуліўся да сцяны магутных дубоў за спіной.

М.Пейган “Ад Мормажава да Залесся. Вёскі Сялецкага прыхода”

# Куроўшчына



У выгадным з гаспадарчага боку месцы сялілі сваіх сялян тагачасныя памешчыкі. Калі з Сяльца ехаць ва ўсходнім напрамку па вуліцы Бярозаўскай, то, мінуўшы апошнюю, як ні шкада, пустую хату, апынешся на ўзвышшы, з якога добра сёння відны першыя двары ўпамянутай вёскі.

Наконт яе назвы. Самы лёгкі варыянт, калі замяніць літару “у” на “о”, то, несумненна, назва вёскі ідзе ад слова “карова”, тым больш што ў мясцовай гаворцы так і гучала Короўшчына. Ёсць, на мой погляд, больш праўдзівы варыянт фарміравання назвы. У аснове яго ляжыць корань «курны» (дымець, курэць), што проста падкрэслівае характар жыцця ў далёкія гады канца XVIII – пачатку XIX ст. Курнаўшчына – пасля страчваецца літара “н”, а гэта вельмі проста і лагічна, так як і наступная трансфармацыя з польскага вымаўлення беларускай гаворкай Кураўшчызна – вельмі доўга гэта была афіцыйная назва. А цяпер, аднак, навуковае тлумачэнне: паходзіць ад славянскага прозвішча Кароўка, быў тут такі першажыхар. Усё роўна карова тут задзейнічана!

М.Пейган “Ад Мормажава да Залесся. Вёскі Сялецкага прыхода”

# Міхнавічы



Пачнем апісанне гісторыі вёскі з першага ўпамінання, якое вядома. Належалі Міхнавічы графіні Анелі Замойскай, на пачатку XIX ст. (1836 г.) налічвалася 91 прыгонная душа, двароў сялянскіх адзінаццаць, папярэдзім, што даныя, на вялікі жаль, не адпавядаюць рэальнасці, няма ў нас дакладных звестак аб каталіцкіх сем'ях, а іх там, па неправеранных чутках, было таксама некалькі, таму можна смела гаварыць аб сотні жыхароў, а хат, магчыма, каля двух дзясяткаў.

М.Пейган "Ад Мормажава да Залесся. Вёскі Сялецкага прыхода"

# Пабежына



Тэрыторыя гэтага населенага пункта, які ў пачатку XX стагоддзя меў назву ўрочышча Пабежына, зараз пакрыта тоўстым люстрам вады рыбгаса “Сялец”. Калісьці пешшу ці конна па старой ружанскай дарозе (рэшта яе захавалася з канца сучаснай прыазёрнай дамбы) і далей на Міхалін, Ружаны чалавек пераадольваў рукавы Ясельды (тут іх мелася аж тры, а калі вёсны былі мнагаводныя, то і пяць; на маёй памяці было тры драўляныя масты, але нумарацыя іх была наступная: першы, трэці, пяты). Пасля пятага маста любы, хто ішоў, калі паварочваў управа, то праз няпоўную вярсту, пераадолеўшы ціхмяную балотную рэчку Турасу, ступаў на непасрэдна пабежынскую зямлю.

М.Пейган “Ад Мормажава да Залесся. Вёскі Сялецкага прыхода”

# Перасмыкі



Аб існаванні гэтага населенага пункта сучасная моладзь зусім нічога не ведае. А ён яшчэ жывы! Калі сваім краязнаўцам прапанаваў наведаць яго, многія выказалі здзіўленне, што дзесьці падобнае існуе, а яго ж толькі за кустоўем, якое разраслося за апошнія гады, не відаць з узвышша ля Сашыцы, а так – на адлегласці выцягнутай рукі.

Наконт назвы. Перасмыкацца на нашай мове – перасунацца, мяняць месца. Значыць, пераехалі тутэйшыя людзі: перасунуліся, перасмыкнуліся. Хаця... Ёсць яшчэ варыянт. Слова “пярэсмык” азначае перашыек, магчыма, што быў нейкі брод ці іншы вадаём, балоціна, якая залівалася вадой, а там праглядвала нейкая частка сушы, што нагадвала дакладную сутнасць слова. Мясцовасць памянялася, але добра вядома, што непадалёк пачынала свой бег з багны Башта, водныя балоціны маглі быць, як і перашыйкі. Упершыню не надта вялікі населены пункт пад назвай “Сялянскае пасяленне Перасмыкі” на карце сустракаецца ў 1911 годзе.

М.Пейган “Ад Мормажава да Залесся. Вёскі Сялецкага прыхода”

# Вёска Радчыцы–

## радзіма вучонага А. Дуніна-Гаркавіча




Сёння павядзем гаворку аб населеным пункце, які і ваколіцай зваўся, і вёскай. І канчатковы лёс яго сумны, як у паэтычных радках нашага знакамітага паэта. Там сапраўды пустка…

Быў ён калісьці ля Ясявіч, дамінаваў у акрузе. Гэта была своеасаблівая, як сёння сказалі б, сістэма хутароў, яна атрымае пасля назву вёска Радчыцы.

У 1924 годзе будзе лічыцца, як і раней, ваколіцай – 24 будынкі, 97 жыхароў. Праваслаўных усяго 8 чалавек, а беларусаў 6. Радчыцы былі размешчаны ў кіламетры ад Ясявіч, дзесьці на паўдарозе да Асекі. Як бачна, заселены яны ў асноўным палякамі. Сапраўды то так, але не тутэйшымі, а пераважна этнічнымі палякамі, якія прыязджалі здаўна з цэнтральнай часткі дзяржавы і набывалі тут зямлю. Такая была палітыка стварэння ачагоў польскасці.

М.Пейган “Ад Мормажава да Залесся. Вёскі Сялецкага прыхода”

# Сашыца



Вёска Сашыца працягнулася з Усходу на Захад болей чым на два кіламетры. Уражвае гаспадарчая разумнасць колішніх першапасяленцаў, якія выбралі менавіта гэтую мясцовасць. Ці то самі прыехаўшыя, ці прывезеныя панамі, людзі пасяліліся на некалькай адлегласці ад лесу і рэчкі Ясельда. Некаторыя агароды ўпіраліся ў лясны масіў, а тут жа былі лугі, значыць, можна было забяспечыць жывёлу пашай, кармамі і зручна, і ў поўнай меры.

Гісторыя Сашыцы багатая і хаваецца ў далёкіх часах…

М.Пейган “Ад Мормажава да Залесся. Вёскі Сялецкага прыхода”

# Ясявічы




Толькі мінаеш некалькі кіламетраў за Сашыцай у заходнім напрамку, калі ўжо і Асека засталася за спіной, як раптам леваруч, з-за масіва маладых дрэў, праглядваецца вёсачка, што мае класічную лінейную забудову строга з поўначы на поўдзень. Сёння тут амаль тая ж колькасць двароў, што і дзвесце гадоў таму.

Вёска Ясявічы ў 1836 г. належала двум гаспадарам. Вядома ж, гэта, па-першае, пані Анелі Замойскай: 18 двароў, 68 мужчын і 55 жанчын. Сем'і Велясевічаў (6 двароў, самы старэйшы ў вёсцы на той момант Велясевіч Аляксей з 1765 г.), Пукала (4 двары), Фамы Краўчука, Кандрата Кобрынскага, Яўфіміі Грышкевіч і Параскевы Пуміловіч. А вось сем сем'яў Карначоў (Сцяпана, Івана, Кандрата, Льва, Герасіма, Мацвея) і Ніпарка (па ўсім выглядае, што прымак), што склала роўна тры двары, належалі панам Чахоўскім – Зафіі Тодараўне і сыну Антонію. Упраўляючым доўгі час у іх быў хтосьці Завітневіч.

М.Пейган "Ад Мормажава да Залесся. Вёскі Сялецкага прыхода"